ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.11.2023 № 519

# Білеты
## для правядзення выпускнога экзамену і экзамену ў парадку экстэрнату пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Геаграфія»

2023/2024 навучальны год

# УКАЗАННІ ДА БІЛЕТАЎ

Пры правядзенні экзамену па вучэбным прадмеце «Геаграфія» асаблівую ўвагу трэба звяртаць на разуменне заканамернасцей прыроды, узаемасувязей грамадства і прыроды, ролі геаграфічных ведаў у вырашэнні сацыяльна-эканамічных і экалагічных праблем, веданне прынцыпаў рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя, уменне карыстацца картаграфічнымі выданнямі. Важна праверыць веды вучняў аб прыродных умовах, рэсурсах, насельніцтве і гаспадарцы Беларусі.

*Першае і другое* пытанні білетаў ахопліваюць асноўны тэарэтычны матэрыял па геаграфіі. У *трэцім* пытанні сфармуляваны заданні на праверку ўмення ўжываць веданне тэорыі на практыцы. Практычныя заданні складаюцца настаўнікам.

## Білет № 1

1. Дынаміка палітычнай карты свету. Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты на палітычнай карце свету, класіфікацыя, прычыны і наступствы.
2. Афрыка. Характарыстыка асноўных кампанентаў прыроды. Праблемы прыродакарыстання.
3. Пабудова дыяграмы ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі і яе аналіз (па статыстычных дадзеных).

## Білет № 2

1. Геаграфія дэмаграфічных працэсаў. Полаўзроставая структура насельніцтва свету. Геаграфія рассялення насельніцтва свету, фактары, формы рассялення.
2. Аўстралія. Гісторыя даследавання. Асноўныя рысы і асаблівасці прыроды.
3. Складанне комплекснай характарыстыкі сваёй мясцовасці па плану з выкарыстаннем карт атласа.

## Білет № 3

1. Фактары і віды міграцыі насельніцтва. Міжнародная міграцыя, дынаміка маштабаў міграцыі ў свеце і рэгіёнах. Бежанства ў сучасным свеце, прычыны і геаграфія.
2. Антарктыда. Гісторыя адкрыцця. Асаблівасці геаграфічнага становішча і прыродных умоў. Сучасныя даследаванні.
3. Пабудова і аналіз ружы вятроў (па прапанаваных дадзеных).

Білет № 4

1. Паверхневыя і падземныя воды Беларусі, іх значэнне і гаспадарчае выкарыстанне.

2. Паўднёвая Амерыка. Геаграфічнае становішча. Асаблівасці прыроды і гаспадарчай дзейнасці насельніцтва. Экалагічныя праблемы.

3. Параўнальная характарыстыка найбуйнейшых транснацыянальных карпарацый (ТНК) свету з выяўленнем падабенстваў і адрозненняў (на прыкладзе двух кампаній на выбар).

Білет № 5

1. Дэмаграфічныя праблемы. Праблема дэмаграфічнай нагрузкі. Сутнасць праблемы старэння насельніцтва, праблема міжнароднай міграцыі.

2. Расійская Федэрацыя. Комплексная геаграфічная характарыстыка.

3. Чытанне плана мясцовасці.

Білет № 6

1. Харчовая праблема. Прычыны голаду і харчовай праблемы ў свеце.

2. Паўночная Амерыка. Геаграфічнае становішча. Асаблівасці прыроды, яе ўплыў на гаспадарчую дзейнасць насельніцтва.

3. Аналіз размяшчэння аднаго з сектараў сусветнай гаспадаркі (на выбар) з выкарыстаннем тэматычнай карты атласа.

Білет № 7

1. Прычыны і сутнасць праблемы вычарпання мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Шляхі вырашэння глабальнай энергетычнай праблемы.

2. Краіны Паўночнай Еўропы: Велікабрытанія; Фінляндыя, Швецыя, Данія, Ісландыя, Нарвегія; Літва, Латвія, Эстонія. Агульная характарыстыка прыроды, насельніцтва і гаспадаркі (на прыкладзе адной з краін).

3. Пабудова графіка ходу тэмпературы паветра за пэўны перыяд і яго аналіз (па прапанаваных дадзеных).

Білет № 8

1. Геапалітычныя праблемы XXI ст., прычыны і наступствы. Праблема міжнароднага тэрарызму. Сутнасць праблемы захавання міру і бяспекі.

2. Еўразія. Геаграфічнае становішча. Агульная характарыстыка прыроды.

3. Аналіз прыродных рэсурсаў як фактара размяшчэння прамысловай вытворчасці Беларусі (на выбар).

Білет № 9

1. Рацыянальнае прыродакарыстанне. Магчымыя шляхі вырашэння глабальных праблем. Паняцце і асноўныя прынцыпы ўстойлівага развіцця чалавецтва.

2. Комплексная геаграфічная характарыстыка Аўстралійскага Саюза.

3. Нанясенне на контурную карту найбуйнейшых цэнтраў аднаго з відаў эканамічнай дзейнасці прамысловасці Беларусі (на выбар).

Білет № 10

1. Геаграфія здабычы нафты, спадарожнага газу і торфу ў Беларусі. Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі. Праблемы і перспектывы развіцця электраэнергетыкі.

2. Комплексная геаграфічная характарыстыка Украіны, Польшчы (на выбар).

3. Аналіз дынамікі міжнароднай міграцыі ў рэгіёнах свету.

Білет № 11

1. Сучасная структура гаспадаркі Беларусі. Спецыялізацыя гаспадаркі. Беларусь у сусветнай супольнасці і месца ў міжнародным падзеле працы.

2. Геаэкалагічныя праблемы гідрасферы. Уздзеянне дзейнасці чалавека на воды сушы.

3. Вызначэнне сярэдняй тэмпературы і амплітуды тэмператур за пэўны перыяд.

Білет № 12

1. Геаграфія насельніцтва Беларусі, яго дынаміка і структура, дэмаграфічныя праблемы. Працоўныя рэсурсы Беларусі і іх ацэнка. Структура і праблемы занятасці працоўных рэсурсаў.

2. Краіны Цэнтральнай Азіі: Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан, Кыргызстан. Агульная характарыстыка прыроды, насельніцтва і гаспадаркі рэгіёну.

3. Вызначэнне абсалютнай і адноснай вышыні аб’ектаў на геаграфічнай карце.

Білет № 13

1. Геаграфічныя даследаванні Беларусі. Найбольш важныя напрамкі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе.

2. Краіны Заходняй Азіі: Азербайджан, Арменія, Грузія. Агульная характарыстыка прыроды, насельніцтва і гаспадаркі краін рэгіёна.

3. Характарыстыка палітыка-геаграфічнага становішча краіны свету (на выбар).

Білет № 14

1. Вытворчасць харчовых прадуктаў у Беларусі. Сучасная геаграфія, фактары размяшчэння і праблемы развіцця.

2. Комплексная геаграфічная характарыстыка Кітайскай Народнай Рэспублікі, Японіі, Індыі (на выбар).

3. Аналіз кліматычных дыяграм (на выбар).

Білет № 15

1. Тэкстыльная і швейная вытворчасць, вытворчасць скуры, вырабаў са скуры і абутку ў Беларусі. Геаграфія вытворчасці, сыравінная база і фактары размяшчэння.

2. Геаэкалагічныя праблемы атмасферы. Уплыў дзейнасці чалавека на атмасферу, клімат і надвор’е. Антрапагенная змена клімату.

3. Вызначэнне па геаграфічнай карце адлегласцей паміж аб’ектамі (з дапамогай маштабу і градуснай сеткі).

Білет № 16

1. Металургічная вытворчасць і вытворчасць гатовых металічных вырабаў Беларусі. Геаграфія вытворчасці.

2. Геаграфія сельскай гаспадаркі свету. Структура і геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету. Геаграфія раслінаводства і жывёлагадоўлі свету.

3. Пабудова дыяграм дынамікі гарадскога і сельскага насельніцтва (па прапанаваных дадзеных) і іх аналіз.

Білет № 17

1. Геаграфія сельскай гаспадаркі Беларусі. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Геаграфія раслінаводства і жывёлагадоўлі.

2. Геаграфія сектара паслуг свету. Геаграфія транспарту свету. Геаграфія фінансавых паслуг у свеце.

3. Характарыстыка геаграфічнага становішча мацерыка (на выбар).

Білет № 18

1. Рэльеф Беларусі, фактары фарміравання. Характарыстыка асноўных форм рэльефу.

2. Геаэкалагічныя асаблівасці літасферы. Асноўныя прыродныя прычыны змены функцый літасферы. Уплыў дзейнасці чалавека на літасферу і яго геаэкалагічныя наступствы.

3. Вызначэнне па статыстычных дадзеных сярэдняй шчыльнасці насельніцтва краіны (на выбар).

Білет № 19

1. Глебы Беларусі. Фактары і працэсы глебаўтварэння. Асноўныя тыпы глебаў, іх уласцівасці і геаграфія.

2. Геаэкалагічныя праблемы біясферы. Праблемы апустыньвання і абязлесення. Роля біёты ў біясферы.

3. Пабудова дыяграмы структуры гаспадаркі і яе аналіз.

Білет № 20

1. Клімат Беларусі. Фактары фарміравання клімату. Асноўныя рысы клімату. Сезоны года. Кліматычныя рэсурсы.

2. Геаграфія прамысловасці свету. Геаграфія і развіццё адной з галін прамысловасці (на выбар).

3. Апісанне па карце ракі, возера або мясцовага воднага аб’екта (на выбар).

Білет № 21

1. Геалагічная будова і карысныя выкапні Беларусі. Найбуйнейшыя радовішчы карысных выкапняў.

2. Сусветная гаспадарка, этапы фарміравання і стадыі развіцця. Фактары міжнароднага геаграфічнага падзелу працы.

3. Характарыстыка эканоміка-геаграфічнага становішча дзяржавы (на выбар).

Білет № 22

1. Геаграфія вытворчасці нафтапрадуктаў, фактары размяшчэння. Геаграфія хімічнай вытворчасці, вытворчасць гумовых і пластмасавых вырабаў у Беларусі.

2. Краіны Паўднёвай Еўропы. Агульная характарыстыка прыроды, насельніцтва і гаспадаркі (на прыкладзе Італіі).

3. Выяўленне заканамернасцей размеркавання кліматычных паясоў і прыродных зон свету на прыкладзе аднаго з мацерыкоў.

Білет № 23

1. Вытворчасць транспартных сродкаў, вытворчасць машын і абсталявання Беларусі. Геаграфія вытворчасці і фактары размяшчэння.

2. Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі, сутнасць і фактары развіцця. Міжнародная эканамічная інтэграцыя.

3. Апісанне па карце асобных раўнін, горных краін (на выбар).

Білет № 24

1. Расліннасць Беларусі. Асноўныя тыпы расліннасці. Жывёльны свет Беларусі. Сучасны відавы склад. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Нацыянальныя паркі, запаведнікі і заказнікі.

2. Комплексная геаграфічная характарыстыка Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, Францыі (на выбар).

3. Вызначэнне азімуту па плане мясцовасці або геаграфічнай карце.

Білет № 25

1. Геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў, цэменту, вапны і гіпсу, вырабаў з бетону ў Беларусі. Фактары размяшчэння.

2. Геаграфія сектара інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій свету. Геаграфія міжнароднага турызму.

3. Аналіз уплыву прыродных умоў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі краіны (на выбар).